**ПАРАЎНАЛЬНАЯ КАНСТРУКЦЫЯ** – слова, словазлучэнне або сказ, якія характарызуюць змест кампанентаў сказа шляхам параўнання.

Параўнанне – адзін з відаў тропа, пабудаваны на характарыстыцы прадметаў і з’яў рэчаіснасці праз супастаўленне іх з іншымі, нечым падобнымі прадметамі і з’явамі.

Вылучаюць некалькі спосабаў выражэння параўнання:

**злучнікавыя параўнанні** – параўнанні, якія ў сваім складзе маюць абавязковы кампанент – параўнальны злучнік; злучнікавыя параўнанні падзяляюцца на:

1) параўнальныя звароты: *Вясёлы гром, нібы грукат калёс, пакаціўся па небе* (Я. Брыль);
2) параўнальныя сказы: *Упала долу першае яркае, поўнае соку лісце, нібы нетутэйшая страката-яркая птушка згубіла сваё пер’е* (А. Жук);

**бяззлучнікавыя параўнанні** – параўнанні, якія звязваюцца са словам, да якога адносяцца, беспрыназоўнікавым і прыназоўнікавым кіраваннем, а таксама паясняльнай сувяззю; бяззлучнікавыя параўнанні выражаюцца:

1) беспрыназоўнікавай формай творнага склону: *Там, за ракою, ... стаіць сцяною лес, нязвыкла ціхі ў гэты перадвячэрні час* (В. Гігевіч); *...У твар мяккім кацяняткам падоўгу лашчылася сонейка...* (В. Карамазаў); *Гаспадаром рассеўся добра такі сталы дуб* (Я. Брыль); *У цэнтры каралевай стаяла блакітная елка* (А. Лойка);
2) living рознымі прыназоўнікава-склонавымі формамі назоўнікаў: *Між галін было відаць вялікае, з шапку, птушынае гняздо* (Л. Арабей); *Той славы з макавае зерне, на грош набытку* (П. Панчанка); *Буйныя, велічынёю з арэх, калівы граду зашасталі па сухім іржышчы, заскакалі па сцежцы* (А. Адамчык);
3) спалучэннем прыметніка *падобны* (са звязкай і без яе) з прыназоўнікава-склонавай формай назоўніка: *Але дзівіў ён* [*ваенны*] *іменна тым, што менш за ўсё быў падобны на ваеннага* (Я. Скрыган); *На карце аазіс падобны на зялёнае дрэва з блакітным стеклом* (Я. Сіпакоў);
4) прыдаткам: *А белыя кветкі, што называюцца гускамі, яшчэ цішэй ляжаць на вадзе, між вялікіх зялёных талерак-лістоў* (Я. Брыль); *Плыве мая песня-крынічанька – бярозавыя берагі* (Г. Бураўкін); *Я кожны дзень бяруся за пяро – І прылятаюць думы-пчолы роем* (К. Буйло); *Напяты ўвысь дарогі-струны, Яны мінулі Марс ужо* (П. Броўка).

**Параўнальны зварот** – адна з формаў выражэння параўнання, якая ўводзіцца ў тэкст пры дапамозе параўнальных злучнікаў (*як, нібы, бы, быццам, як быццам, што* і інш.) і складаецца з самастойнай часціны мовы з залежнымі словамі і без іх.

У залежнасці ад асаблівасцей структуры параўнальныя звароты могуць быць:

**неразвітыя** (неразгорнутыя, аднаслоўныя), якія выражаны адным самастойным словам (як правіла, назоўнікам у форме розных склонаў, прыметнікам, прыслоўем і інш.): *Халоднае паветра было празрыстым, як крышталь* (У. Краўчанка); *У лесе гэтак жа ціха, як і ў полі* (А. Жук); *Хлопцы, як зачараваныя, глядзелі на гэты інструмент, выгладжаны пальцамі да бляску* (М. Чарняўскі); *І толькі над пожняй кугікае кнігаўка, як заўсёды, жалобна* (В. Гігевіч); *Баравікі рыпелі ў руках, нібы гумавыя* (В. Дайліда); *Рэдка, нібыта і не хацеў, пасыпаўся град* (В. Адамчык);

**развітыя**, якія ўключаюць назоўнік і залежныя ад яго словы: *Уздоўж палеткаў, абочын сцяжын паўсталі, быццам дзеці з блакітнымі вачанятамі, васількі* (Я. Пархута); *Дочкі весела шчабяталі, як тыя ластаўкі, і туліліся да яго* (М. Паслядовіч); *...У залатым, утульным лесе, у адзіноце я чытаў бунінскі “Храм сонца”, прымаў яго словы, нібы духмяны ліпавы мёд, маленькімі дозамі, па некалькі старонак у дзень...* (Я. Брыль).

Паводле семантыкі і функцыі параўнальныя звароты падзяляюцца на:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**вобразныя параўнальныя звароты** – звароты, якія праз асацыяцыйнае супастаўленне выразна характарызуюць прадметы і з'явы, ствараючы мастацкія вобразы: *З раніцы і да позняга вечара, нібы тыя жывыя ручайкі, звіняць у веснавым небе палявыя жаваранкі* (Р. Ігнаценка); *Яны* [*дзеці*] *высыпалі з-пад зялёнай павеці, нібы чародка гаманлівых вераб'ёў* (Я. Брыль); *Вісела ноч, чорная, як пераараная ўвосень зямля* (І. Пташнікаў); *Зоркі, як змоўшчыцы, бачылі ўсё* (Я. Брыль);

**параўнальна-раўналежныя звароты** – звароты, якія толькі канстатуюць тоеснасць, падабенства, адпаведнасць або неадпаведнасць прадмета параўнання з аб'ектам параўнання: *Лісце, як і карэнне, гадуе дрэва* (І. Навуменка); *На вуліцы, як і раней, мітусіўся снег* (Я. Колас); *Ва ўсёй беларускай літаратуры знойдзецца не многа твораў настолькі паэтычных, як "Новая зямля"* (А. Адамовіч).

Параўнальныя звароты як кампаненты ўскладненага сказа трэба ўмець адрозніваць ад даданай параўнальнай часткі складаназалежнага сказа, у якой апушчаны выказнік:

1) параўнальная канструкцыя з'яўляецца даданым сказам, калі ў ёй ёсць даданыя члены не толькі з групы дзейніка, а і з групы выказніка;
2) параўнальная канструкцыя з'яўляецца зваротам, калі ў ім няма даданых членаў з групы выказніка.

Існуе некалькі поглядаў на сінтаксічную ролю параўнальных зваротаў:

1) не з'яўляюцца членамі сказа, паколькі параўнальныя звароты – своеасаблівыя дапаможныя адзінкі, што змяшчаюць дадатковую інфармацыю адносна зместу ўсяго сказа ці яго асобных кампанентаў;
2) з'яўляюцца рознымі членамі сказа (акалічнасцямі, азначэннямі, прыдаткамі, дапаўненнямі і інш.);
3) з'яўляюцца толькі акалічнасцямі спосабу дзеяння.

Стылістычная роля любых моўных адзінак акрэсліваецца іх мэтавым прызначэннем, функцыянальнымі магчымасцямі ў тэксце.

Вылучаюць дзве асноўныя стылістычныя функцыі параўнанняў:

**стылеадрознівальная функцыя** заключаецца ў стылістычнай узгодненасці параўнання з агульным характарам тэксту; параўнанне як вобразна-выяўленчая адзінка з'яўляецца адным са сродкаў, якія выразна характарызуюць (разам з іншымі тропамі: эпітэтам, метафарай, перыфразай, гіпербалай і інш.), у першую чаргу, стыль мастацкай літаратуры;

**вобразна-выяўленчая функцыя** выяўляе параўнанне як адзін з актыўных сродкаў рэалізацыі ідэйна-мастацкай задумы аўтара, паказвае істотныя бакі вобразна-асацыяцыйнага мыслення пісьменніка, садзейнічае індывідуалізацыі пры апісанні персанажаў, прыроды і інш.: *Прыгожы быў позірк светла-блакітных вачэй пад густымі, сівымі брывамі, вачэй адкрытых і чыстых, як само бясхмарнае неба, паўторанае ў крынічным люстры бяскрайняга возера* (Я. Брыль); *Касцовы ж рукі пад вечар гулі, як тэлеграфныя слупы, спаць чалавек валіўся, як сноп, а пасля сну, абы зноў упрогся ў касу, гудзенне паўтаралася і набірала стомы больш ды больш – патрошку, спакваля, на загартоўку і ў запас* (Я. Брыль); *На клумбе – згорбілася і расставіла рукі, як бабуля над градамі, старая, няшчасная яблыня* (Я. Брыль); *Ён* [*клёнік*] *стаіць цяпер недзе ў полі, прывязаны перавяслам да слупка, трымаецца гэтай саломеннай ручкай за апорыну, як той маленькі хлопчык, што сам не ўмее хадзіць* (Я. Брыль).

*Р.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ